**Назва ТВП:** Стары Жадзен

© С. Левый

**Код:** BY039

**Геаграфічныя каардынаты:** 51°53' N 27°35' E

**Адміністрацыйная прыналежнасць:** Гомельская вобласць: Жыткавіцкі раён

**Плошча:** 16124 га

**Крытэрыі:** A1

**Нацыянальны прыродаахоўны статус:** не мае

**Міжнародны прыродаахоўны статус:** ТВП міжнароднай значнасці

## Агульнае апісанне:

Леса-балотны комплекс, ядро якога складаюць балоты Стары Жадзен і Вялікае, раздзеленыя паміж сабой пакатай градой. Найбольш характэрнымі ландшафтамі тут з’яўляюцца верхавыя і пераходныя балоты, а таксама хваёвыя лясы.

Лясная расліннасць прадстаўлена шырокім спектрам супольніцтваў ад лішайнікавых хвойнікаў на старажытных эолавых дзюнах да чарнічных бярэзнікаў па іх падножжах і касачовых ольсаў па міжградавых паніжэннях. Ва ўзроставых адносінах лясы ў асноўным належаць да катэгорыі прыспяваючых. Па цяжкадаступных мінеральных астравах месцамі захаваліся дрэвы, узрост якіх перавышае 100-120 гадоў.

З фларыстычнага пункту гледжання найбольшы інтарэс уяўляюць мінеральныя грады і ўскраіны балот. Менавіта тут адзначана большасць ахоўваемых відаў раслін. Несумненную каштоўнасць маюць і пераходныя балоты з асокамі прамой *Carex elata* і валасістаплоднай *Carex lasiocarpa*, рэдкія ў рэгіёне і ў Беларусі. Рададэндран жоўты *Rhododendron luteum*, які расце па пакатых схілах мінеральных астравоў, мае, акрамя таго, і міжнародны статус аховы. Вялікі інтарэс уяўляюць таксама рэдкія для Беларусі плюшчай малы *Sparganium minor*, танканог вялікі *Koeleria grandis* і маннік складчаты *Glyceria plicata*. Даволі верагоднае знаходжанне тут расніцы прамежкавай *Drosera intermedia* і чаротніка белага *Rhynchospora alba*, якія сустракаюцца на прымыкаючых да ТВП балотах.

Сярод балот пераважаюць верхавыя водападзельнага тыпу. Па іх перыферыі і ў міжградавых паніжэннях знаходзяцца залітыя вадой пераходныя і нізінныя балоты. Уздоўж зарослых меліярацыйных каналаў пераважаюць звычайна трыснягі.

Гідралагічная сетка прадстаўлена некалькімі старымі меліярацыйнымі каналамі, пракапанымі яшчэ ў канцы 19 стагоддзя. Вада па іх сцякае ў раку Сцвіга і канал Бычок. Гэтыя каналы зараслі воднай расліннасцю, месцамі перакрыты сплавінамі. Шматлікія бабровыя плаціны затрымліваюць сток вады з балот. Воднае харчаванне балотных масіваў адбываецца ў асноўным за кошт атмасферных ападкаў.

З-за высокай ступені забалочанасці і слабага развіцця дарожнай сеткі тэрыторыя цяжкадаступная, населеныя пункты тут адсутнічаюць. Акрамя таго, ТВП уваходзіць у буферную зону Прыпяцкага нацыянальнага парка і Палескага ваеннага палігона.

Асноўныя віды выкарыстання тэрыторыі – лесагаспадарчае і паляўнічае. Высечкі лесу вядуцца толькі па перыферыйных участках угоддзя. Лясныя ўгоддзі выкарыстоўваюцца мясцовым насельніцтвам для збору ягад і грыбоў, балота – для нарыхтоўкі журавін і выпасу жывёлы.

## Асноўныя біятопы:

Балоты верхавыя и пераходныя – 60%, лясы – 40%.

## Птушкі:

На ТВП адзначана 12 відаў птушак, занесеных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь. Тэрэторыя мае значэнне для захавання некалькіх пар вялікага арлеца *Aquila clanga*. Акрамя таго тут адзначаны яшчэ некалькі глабальна пагражаемых відаў: вялікі грыцук *Limosa limosa*, вялікі кулён *Numenius arquata*.

## Іншыя групы жывел:

Ядро фауністычнага комплексу ўтвараюць віды, экалагічна звязаныя з лясными і балотнымі экасістэмамі. Паколькі тэрыторыя амаль не асвоена людзьмі, тут даволі поўна прадстаўлены найбольш рэдкія і ўразлівыя віды фауны рэгіёна.

У недалёкім мінулым на тэрыторыі ТВП і па пойме ракі Сцвіга адзначаўся глабальна знікаючы від – еўрапейская норка *Mustela lutreola*. Гэта адно з двух апошніх (другое на поўначы Беларусі, у Паазер'і) раз'яднаных між сабой месцаў пражывання гэтага віду ў Беларусі. Улічваючы, што тэрыторыя даследавана пакуль што недастаткова, новыя знаходкі еўрапейскай норкі ўяўляюцца тут даволі верагоднымі.

Ва ўгоддзі сустакаецца бабёр рачны *Castor fiber*, выдра *Lutra lutra* і соня лясная *Dryomis nitedula*. У зімовы час неаднаразова назіраліся заходы рысі *Lynx lynx*. З ахоўваемых прадстаўнікоў герпетафауны адзначаецца грабеньчаты трытон *Triturus cristatus*, вядомы адзінкавыя знаходкі балотнай чарапахі *Emys orbicularus* і мядзянкі *Coronella austriaca*.

## Стан рэдкіх відаў птушак:

| Віды | Статус | Колькасць | Год/перыяд ацэнкі | Дакладнасць ацэнкі | Трэнды (2004-2010) | Крытерый ТВП |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Чорны бусел *Ciconia nigra* | гн | + | 2004 | П | | |

| Віды | Статус | Колькасць | Год/перыяд ацэнкі | Дакладнасць ацэнкі | Трэнды (2004-2010) | Крытерый ТВП |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Арлан-белахвост *Haliaeetus albicilla* | гн | 4 п | 2004 | Д | | |
| Арол-вужаед *Circaetus gallicus* | гн | + | 2004 | П | | |
| Малы арлец *Aquila pomarina* | гн | + | 2004-2010 | П | | |
| Арлец вялікі *Aquila clanga* | гн | 6 п | 2004-2010 | Д | ↔ | A1 |
| Журавель шэры *Grus grus* | гн | + | 2004 | П | | |
| Грыцук вялікі *Limosa limosa* | гн | + | 2004 | П | | |
| Кулён вялікі *Numenius arquata* | гн | + | 2004 | П | | |
| Кулік-селянец *Tringa nebularia* | гн | + | 2004 | П | | |
| Кугакаўка барадатая *Strix nebulosa* | гн | 10 п | 2007 | Э | | |
| Дзяцел беласпінны *Dendrocopos leucotos* | гн | + | 2004 | П | | |

| Віды | Статус | Колькасць | Год/перыяд ацэнкі | Дакладнасць ацэнкі | Трэнды (2004-2010) | Крытерый ТВП |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Дзяцел жоўтагаловы *Picoides tridactylus* | гн | + | 2004 | П | | |

## Іншыя рэдкія і знаходзячыеся пад пагрозай знікнення віды:

Расліны: рададэндран жоўты *Rhododendron luteum*, вярба чарнічная *Salix myrtylloides*, вярба лапландская *Salix lapponum*, плывунец малы *Utricularia minor*, плывунец прамежкавы *Utricularia intermedia*, асака балоталюбівая *Carex heleonastes*, сон лугавы *Pulsatilla pratensis*, сон лугавы *Pulsatillapratensis*, фіялка багнавая *Violauliginosa*, журавіны дробнаплодныя *Oxyccocusmicrocarpus*.

## Пагрозы:

Размяшчэнне ТВП у цяжкадаступнай мясцовасці станоўча адбіваецца на стане прыродных комплексаў. Нягледзячы на тое, што на поўначы ўгоддзя працягвае дзейнічаць асушальная сетка, яго гідралагічны рэжым блізкі да натуральнага. Высокая абваднёнасць тэрыторыі перашкаджае ўзнікненню пажараў. Высечкі лесу з-за высокай забалочанасці тэрыторыі носяць абмежаваны характар.

Пэўную пагрозу ўяўляе выпас жывёлы на балоце. У выніку пастаяннага прагону жывёл каля летніх стойбішчаў утвараюцца шырокія сцежкі. Выпас жывёлы ў веснавы час з’яўляецца значным фактарам турботы для дзікіх жывёл і здольны нанесці значную страту біяразнастайнасці.

Як следства браканьерства колькасць шэрагу паляўнічых відаў (лось, глушэц) значна ніжэй біялагічнай ёмкасці ўгоддзя.

## Рэкамендацыі па захаванню:

З мэтай захавання ландшафтнай і біялагічнай разнастайнасці ўгоддзя тут неабходна стварыць рэспубліканскі ландшафтны заказнік. Стварэнне на гэтым участку ахоўваемай тэрыторыі дасць магчымасць захаваць экалагічны калідор між двума буйнейшымі прыроднымі комплексамі Палесся – нацыянальным паркам

«Прыпяцкі» і заказнікам «Альманскія балоты».

## Крыніцы інфармацыі:

Асабістыя паведамленні: Дамброўскі В.Ч.

Скарбы прыроды Беларусі. – Мн.: Беларусь, 2005. – 215 с. (Інфармацыю падрыхтавалі: Дамброўскі В.Ч., Максіменкаў М.В., Скуратовіч А.М., Навіцкі Р.В.).

Созинов О.В., Груммо Д.Г., Зеленкевич Н.А., Цвирко Р.В., Жилинский Д.Ю., Броска Т.В. Редкие и исчезающие виды цветковых растений заказника «Старый жадень» // Красная книга Республики Беларусь: состояние, проблемы, перспективы: материалы международной научной конференции, Витебск, 13-15 декабря 2011 г. – Витебск., 2011 г. – с. 7-9.

**Складальнікі :** Дамброўскі В.Ч.

---

* *Выкарыстанне змешчанай тут неапублікаванай інфармацыі для навуковых публікацый без пісьмовай згоды яе аўтараў забаронена. У выпадку выкарыстання часткі кантэнту або старонкі цалкам на іншых інтэрнет-рэсурсах, абавязковая спасылка на аўтараў і сайт iba.ptushki.org*